такие замыслы были. Возвращение в Тверь из Санкт-Петербурга, поступление преподавателем в Тверскую духовную семинарию, необходимость материально обеспечивать большую семью после смерти отца и, как следствие, невозможность работать в архивах Москвы и Санкт-Петербурга, сделали эти замыслы несбыточными.

На протяжении всей жизни, В.И. Колосов сохранил интерес к церковной истории XVII в., но большинство сюжетов его сочинений были связан с уроженцами тверского края. Предметом исследований местного историка была именно тверская история.


1. Журналы, общего собрания Совета Академии 10 июня 1878 г. // Журналы заседаний Совета Санкт-Петербургской духовной академии за 1877–1878 уч. год. – СПб. : тип. Ф.Г. Елеонского и К°, 1878. – 316 с.
2. Журналы, общего собрания Совета Академии 24 октября 1879 г. // Журналы заседаний Совета Санкт-Петербургской духовной академии за 1879–1880 уч. год. – СПб. : тип. Ф.Г. Елеонского и К°, 1880. – 253 с.
3. Колосов, В.И. В Новом Иерусалиме (путевые заметки) / В. Колосов // Древняя и Новая Россия. – 1880. – Ч. XVIII. Сентябрь. – С. 365–376.
4. [Колосов, В.И.] Взгляд Никона на значение патриаршей власти / В. К-в // Журнал Министерства народного просвещения.– 1880. – Ч. CCXII. Дек. – С. 233–267.
5. Колосов, В.И. К вопросу о государствовании патриарха Никона / В. Колосов // Древняя и новая Россия. – 1881. – Т. XIX. – С. 199–201.
6. Колосов, В.И. «Патриарх Никон. Тетрадь III». – Государственный архив Тверской области. – Ф. 103. – Оп. 1. – Д. 783.
7. Колосов, В.И. Попытки канонизации патриарха Никона / В. Колосов // Исторический вестник. – 1880. – Т. II. – С. 793–796.
8. Румянцева, М.Ф. О культурной составляющей исторического знания / М.Ф. Румянцева // Исторический журнал: научные исследования. – 2012. – № 3(9) – С. 7–13.


**Півавар М.В.**

## СЯДЗІБЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Сядзібная культура – важная арганічная частка гісторыка-культурнай спадчыны краіны, звязаная не толькі з архітэктурай, народным дойлідствам, але і рознымі відамі мастацтва і духоўнай культуры народа.

Сядзібазнаўства – досыць маладая галіна краязнаўства. На Берасцейшчыне і Гродзеншчыне ўжо праводзяцца сур'ёзныя работы па фарміраванню каталога сядзіб, апісанню страчанага і таго, што дайшло да нашага часу, вывучэнне генеалогіі ўласнікаў. Але абагульняючай работы, прысвечанай палацам і сядзібам не толькі Віцебшчыны, але і Беларусі ў цэлым, дасюль няма. Цікавасць да гэтай тэмы досыць вялікая, але яна пакуль не прыцягнула ўвагі спецыялістаў. Даследаванні абазнаных архітэктараў пакуль маюць эпізадычны характар. Гэты артыкул, спроба прадставіць асноўныя накірункі працы, зробленай па вывучэнні сядзіб Віцебшчыны.

Першай працай, прысвечанай гісторыі, архітэктуры сядзіб Віцебшчыны з'яўляецца работа Цэханавецкага "Хроника одного поместья: Бочейково" [22]. На мяжы стагоддзяў, у Расіі выдаваўся часопіс "Столица и усадьба"(№ 1–90, 1913–1917), але ці змяшчаў ён матэрыялы па сядзібам Віцебшчыны нам невядома. Некалькі невялікіх артыкулаў У. Адамава прысвечаны паркам, садам, і гаспадарцы некаторых маёнткаў краю: Бачэйкаўскаму, Бешанковіцкаму, Вялікалятчанскаму, Фатыні [1].

Толькі з сярэдзіны 1980-х гг. даследаванню былых панскіх сядзіб на Беларусі пачынае надавацца пэўная ўвага даследчыкаў. Выключэннем выглядае выданне А. Кулагіна "Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии" [10]. У ім разглядаюцца, галоўным чынам архітэктура палацаў і сядзіб, планіровачныя прынцыпы пабудовы палацава-сядзібных комплексаў Беларусі.

У кнізе "Страчаная спадчына" [16] асобны раздзел "Па колішніх маёнтках" прысвечаны зруйнаваным сядзібам Беларусі. Пададзены ён пад аўтарствам А. Кулагіна, але ўяўляе сабой пераклад асобных артыкулаў з выдання Р. Аўтаназы "Былыя сядзібы на ўскраінах Рэчы Паспалітай" [25]. З іх 6 з Віцебшчыны. Пры чым, згадкі на гэтага аўтара няма ні ў артыкулах, ні ў спісе літаратуры. Дапушчаны і памылкі. Сядзіба Чарнаручча Эльўнераў знаходзілася не ў Лепельскім павеце, а ў былым Віцебскім, сучасны Лёзненскі раён.

Паркі Беларусі, як частка палацавых і сядзібных ансамбляў сталі тэмай даследавання доктара біялагічных навук А.Т. Федарука. У 1970–1980-я гг. асноўная тэмай даследавання навукоўцы была культурная дэндрафлора Беларусі. Вынікам шматгадовай працы сталі кнігі: "Древесные растения садов и парков Белоруссии", "Старинные парки Белоруссии: Инвентаризация, стилевые особенности, сохранение и функциональное использование", "Садово-парковое искусство



Репозиторий ВГУ

Беларуси" [19]. У пазнейшы час увага даследчыка была акцэнтавана на вывучэнні сядзіб і палацаў, у пераважнасці цэнтральнай і Заходняй Беларусі [21]. На жаль, стану сядзіб Віцебшчыны, А. Федаруком прысвечана толькі адна публікацыя, змешчаная ў "Віцебскім сшытку" [20].

В.Р. Анціпаў прысвяціў сваю кнігу стану паркаў у Беларусі "Парки Белоруссии" [2]. Ускосна аўтар закранае і сядзібы, без іх, як правіла не было і паркаў. Тэмай дысертацыі даследчыцы Н.С. Будыцы на атрыманне ступені кандыдата архітэктуры стала таксама садова-паркавая спадчына Беларусі [3].

У 1985 г. выйшаў у свет Віцебскі том манументальнага выдання "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" [8]. У ім змяшчаецца інфармацыя пра некаторыя сядзібы краю. Але выданне мае заідэялагізаваны характар. Галоўнай на той час задачай, было паказаць савецкую гісторыю, подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Таму большасць сядзіб у ім не згадваецца. Напрыклад, у Віцебскім раёне ўказана толькі адна – Здраўнёва, хаця на той час у досыць добрым стане іх было не менш пяці: у в. Мазалава, В. Лётцы, Лукі, Брыгітполле, Сасноўка.

Віцебшчына пасля пераезда ў Віцебск Ю. Якімовіча стала асноўнай тэмай даследавання гэтага выдатнага вучонага. Шэраг артыкулаў у "Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі" прысвечаны сядзібам [23]. Шмат друкаваў артыкулаў па гэтай тэме ў мясцовым перыядычным друку [24]. Ён жа распрацаваў і ўклаў слоўнік тэрмінаў, гаспадарчых, вытворчых пабудоў і дэталяў сядзібнай архітэктуры (1991).

Асаблівую каштоўнасць уяўляюць працы мясцовых віцебскіх краязнаўцаў, якія ўдакладняюць дэталі, лакалізуюць месцы знаходжання страчаных маёнткаў, стан існуючых. Гэта М. Баўтовіч (Полаччына), М. Гіль (Пастаўшчына) [6], В. Карасёў (Полаччына) [9], М. Паўлаў [12], К. Шыталь, Скараход (Докшыччына), К. Шыдлоўскі (Браслаўшчына), В. Ермалёнак (Мёршчына), А. Бубала (Дрысеншчына), Я. Бунто (Дзісненшчына), В. Грыбко (Чашніччына) [7], С. Глушкоў (Полаччына), А. Райчонак, У. Ляскоўскі, К. Кожан (Шаркоўшчына), У. Скрабатун (Глыбоччына), А. Шынкевіч (Аршаншчына), І. Януш (Лепельшчына) [17]. Пэўную інфармацыю пра сядзібы можна атрымаць у вучэбна-інфармацыйных выданнях прысвечаных раёнам [4, 7, 13], кнігах "Памяць" [11]. Нацыянальнае агенцтва па турызму выдала буклет пра сядзібы Полаччыны [18].

Некаторыя энцыклапедыі змяшчаюць артыкулы, прысвечаныя сядзібам краю [14]. Але ў асноўным, яны паўтараюць інфармацыю са "Збораў помнікаў" і кніг "Памяць". Артыкулы, прысвечаныя стану сядзіб Віцебшчыны можна знайсці на старонках перыядычнага друку: бюлетэня "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі" ("Спадчына"). Напрыклад, сядзібнай архітэктуры Віцебшчыны прысвяціў артыкул С. Сергачоў [15].

У краязнаўчым альманаху "Руская усадьба", які выдаецца як дадатак да часопіса "Наше наследие" у Расіі эпізадычна сустракаюцца некаторыя матэрыялы і па Віцебшчыне.

Польскі даследчык Раман Афтаназы выдаў 12-томную працу "Былыя сядзібы на даўніх ускраінах Рэчы Паспалітай". У тамах 1, 4 можна знайсці звесткі пра сядзібы на Віцебшчыне. Праўда, толькі тыя, што належалі каталіцкай шляхце [25].

Асобна варта адзначыць электронныя рэсурсы, на якіх можна знайсці інфармацыю, прысвечаную сядзібам: сайты "Радзіма орг", "Глобус Беларусі", "Radzima.net: Найди свои корни в Беларуси и Литве".

Такім чынам, пэўная інфармацыя па гісторыі, архітэктуры сядзіб Віцебшчыны маецца. Але комплексная праца па складанню каталога маёнткаў, апісанню іх архітэктуры, складанню радаводаў уласнікаў яшчэ наперадзе.


1. Адамаў, У.У. Бальшалятчанскі сад // Віцебшчына. – Віцебск, 1925. – Т. 1. – С. 173; Ён жа. Бачэйкаўскі сад і палац // Тамсама. – С. 176–179; Бешанковіцкі сад // Тамсама. – С. 167–168; Фатыньскі сад і гаспадарка // Тамсама. – С. 157–163.
2. Антипов, В.Г. Парки Белоруссии / В.Г. Антипов. – Минск : Ураджай, 1975. – 200 с.
3. Будыко, Н.С. Садово-парковое наследие Белоруссии (Дооктябрьский период): Автореф. дис. … канд. архитектуры : 18.00.04 / Моск. архитектур. ин-т / Н.С. Будыко. – М., 1985. – 17 с.
4. Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; аўт.-уклад. М.В. Півавар. – Мінск : Паркус плюс, 2008. – 328 с.
5. Гарады і раёны Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск: БелЭн; Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. / редкол.: Т.В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 2011.
6. Гіль, М. Былыя сядзібы і паркі Паазер'я. Мядзельшчына / М. Гіль, Я. Драўніцкі. – Паставы: ВІ "Сумежжа", 2008. – 64 с.
7. Грыбко, В.В. Гістарычна-краязнаўчы курс "Наша Чашніччына" (Чашнiказнаўства) / В.В. Грыбко – Мінск : Медисонт, 2007. – С. 60.
8. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская воблаць . – Мінск : БСЭ, 1985. – 496 с.
9. Карасёў, В. Па гістарычных мясцінах Полацкай зямлі / В. Карасёў. – Мінск : Пачатковая школа, 2011. – 72 с.
10. Кулагин, А.Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии. Вторая половина XVIII – начало XIX в. / А. Н. Кулагин. – Минск: Наука и техника, 1981. – 134 с.

11. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 630 с.; Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. – Мінск : Паліграфафармленне, 1998. – 710 с.
12. Паўлаў М. Бачэйкаўскі палац і парк. – Віцебск: друк. імя Камінтэрна,1989. – 8 с.
13. Пракаповіч І. Чароўны край – Пастаўшчына : (гісторыка-краязнаўчы курс «Паставазнаўства»). – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 304 с.
14. Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 2. – Витебская область. В 2 кн. Кн. 2 / редкол.: Т.В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 2011.
15. Сергачоў, С. А. Сядзібная архітэктура Віцебшчыны / С. А. Сергачоў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1972. – № 1. – С. 22–25.
16. Страчаная спадчына / Т. В. Габрусь, А. М. Кулагін, Ю. У. Чантурыя, М. А. Ткачоў; уклад. Т. Габрусь. – Мінск : Беларусь, 2003. – 351 с.
17. Януш, І. Адкуль мы пайшлі. З гісторыі лепельскага краязнаўства // Лепельшчына / уклад. В. Тухто. – Мінск, 2016. – С. 74–97.
18. Усадьбы известных людей на Полотчине. – Минск : Нацыянальнае агенцтва па турызму, 2007.
19. Федорук, А.Т. Садово-парковое искусство Беларуси / А. Т. Федорук. – Минск : Ураджай, 1989. – 247 с.
20. Федарук А. Культурна-гістарычная каштоўнасць і сучасны стан шляхецкіх сядзіб Віцебшчыны // Віцебскі сшытак. – 2000. – №. 4. – С. 84–89.
21. Федорук, А. Старинные усадьбы Берестейщины / А. Федарук. – Минск : БелЭн, 2006. – 575 с.
22. Цехановецкий, В.М. Хроника одного поместья: Бочейково / В.М. Цехановецкий. – Витебск, 1905.
23. Якімовіч, Ю. Беліцкая сядзіба // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. – Мн., 1984. – Т. 1. – С. 419; Ён жа, Іванская сядзіба // Тамсама. – Т. 2. – С. 553; Ён жа, Копыская сядзіба // Тамсама. – Т. 3. – С. 106–107.
24. Якімовіч, Ю. Архітэктурны ансамбль у Лынтупах / Ю. Якімовіч // Віцебскі рабочы (ВР). – 1992. – № 47, 48; Ён жа. На Дубровенцы і Дняпры [г.п. Дуброўна] // ВР. – 1992. – № 139. – С. 3; У далёкім васямнадцатым стагоддзі [Дубровеншчына] // ВР. – 1993. – № 117. – С. 5.
25. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. – Wyd. 2. – Cz. 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. – T. 1. Województwa mińskie, mścisławskie, połockie, witebskie. – Wrocław: Ossolineum, 1996. – 335 S.; Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. – Wyd. 2. – Cz. 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. – T. 4. Województwo wileńskie. – Wrocław: Ossolineum, 1993. – 547 S.

**Тогулева А.Д.**

## АГЛЯД КРЫНІЦ І ГІСТАРЫЯГРАФІІ 1920-х гг. ПА ПЫТАННІ ЎЗНІКНЕННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ

Важнай крыніцай звестак па гісторыі беларускай нацыянальнай партыі – Беларускай Сацыялістычнай Грамады з’яўляецца тая навукова-гістарычная спадчына, якая была створана ў 1920-я гады сябрамі БСГ і іх сучаснікамі.

У 1918 г. у Маскве выйшаў у свет нарыс вядомага дзеяча беларускага руху старшыні Беларускага абласнога камітэта Я.С. Канчара “Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов. Часть II” [21]. Нарыс змяшчае надзвычай цікавы матэрыял аб падзеі выключнай важнасці ў жыцці беларускага народа – 1-м Усебеларускім з’ездзе, непасрэдным ініцыятарам і ўдзельнікам якога быў сам аўтар. Да свайго нарысу Я. Канчар дадае цэлы шэраг рознаадрасных пратэстаў супраць гвалтоўнага разгону з’езда бальшавікамі, сярод якіх ёсць і пратэст БСДРП, якая ўтварылася з левага крыла Петраградскай арганізацыі БСГ.

У 1919 г. пад грыфам Петраградскага аддзелу Белнацкама выйшла другая праца Я. Канчара “Белорусский вопрос” [20]. Тэматыка гэтай кнігі надзвычай шырокая – тут і статыстычныя дадзеныя пра Беларусь, і кароткі агляд асноўных этапаў гісторыі беларускага народа, яго культуры. Галоўную ўвагу аўтар канцэнтруе на аналізе асноўных патрабаванняў беларускага вызваленчага руху, абгрунтаванні права насельніцтва Беларусі на стварэнне ўласнай дзяржавы.

Агульныя пытанні беларускага нацыянальна-вызваленчага руху на пачатку ХХ ст., а таксама пытанні аб узнікненні і дзейнасці БСГ разглядаюцца ў працах Я. Варонкі, А. Луцкевіча, Ф. Турука, У. Пічэты [6; 27; 30; 28]. Публікацыі гэтых аўтараў змяшчаюць каштоўны матэрыял, асабліва кніга Ф. Турука “Белорусское движение”, якая побач з аўтарскім тэкстам мае дадатак у складзе 31 дакумента. Сам Ф. Турук быў членам БСГ, дэлегатам ІІІ партыйнага з’езда і кандыдатам у ЦК БСГ. У сваёй працы ён дае агляд гісторыі БСГ з моманту яе ўзнікнення ў 1903 г. і да яе распаду ў 1918 г.

Крыніцай звестак аб Беларускай Сацыялістычнай Грамадзе з’яўляюцца публікацыі А. Бурбіса “Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху” [29] і “БСГ у першым перыядзе яе працы” [5]. Аляксандр Бурбіс – гэта чалавек, які прымаў актыўны ўдзел ў стварэнні БСГ у 1903 г., быў членам ЦК БСГ у 1906 г., а пасля лютага 1917 г. узначальваў Маскоўскую арганізацыю БСГ. З гэтай прычыны яго працы па гісторыі першай беларускай нацыянальнай партыі маюць выключнае значэнне. Яны змяшчаюць багаты фактычны матэрыял аб дзейнасці БСГ, а таксама і асабістыя вывады аўтара ў адносінах да таго ці іншага пытання. Гэтыя публікацыі напісаны не паводле дакументальных даных, а паводле ўспамінаў сябра партыі. З прычыны гэтага, ён аб усіх падзеях у гісторыі БСГ кажа ў агульных рысах, не дастаткова дэталізуе той ці іншы бок, або з’яву з яе жыцця і дзейнасці.

Репозиторий ВГУ